# Быць разам са сваім народам

**Ірына ДАРАФЕЕВА, заслужаная артыстка Беларусі, загадчыца кафедры эстраднай музыкі БДУКМ, член журы 32-га Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск":**

— "Славянскі базар у Віцебску" для мяне заўжды доўгачаканы, пачынаючы яшчэ з таго часу, як я ў 16 гадоў зрабіла свае першыя крокі на сцэне Віцебскага амфітэатра. Тады ж і загадала, што калісьці правяду тут свой сольнік. І я ўдзячная ўсім, хто мяне падтрымліваў усе гэтыя гады. Бо сёлета тая мара здзейсніцца. Летась на гэтым фестывалі ўжо быў мой сольнік, але ў Канцэртнай зале "Віцебск". А сёлета — у Амфітэатры, пасля першага конкурснага дня, дзе ўдзельнікі праспяваюць славянскі хіт. І гэта дадатковая адказнасць, бо на выступленне членаў журы глядзяць як на своеасаблівы майстар-клас.



У мяне заўсёды шмат канцэртаў. Дзень народзінаў, што прыпадае на Купалле, таксама часцяком сустракаю на выступленнях — гэта нават не традыцыя, а стыль жыцця, мой лёс. Бо быць разам са сваім народам і дарыць яму сваё мастацтва — вялікі гонар і шчасце. Гэты год быў асабліва насычаным, было шмат творчай працы: я ж пастаянна ў пошуку. Днямі ўдзельнічала ў Рэспубліканскім свяце ў Александрыі. Гэта мае родныя мясціны, таму адтуль паехала да бацькоў, якія сёлета спраўляюць рубінавае вяселле — 55 гадоў разам. Святкуем разам гэты юбілей і мой дзень народзінаў — на беразе Дняпра, у атачэнні прыроды з яе боскай прыгажосцю.

А "Славянскі базар у Віцебску" для мяне папраўдзе асаблівы, гэта феерыя пачуццяў і свята жыцця. Я двойчы ўдзельнічала ў конкурсе. Пасля першага такога спаборніцтва, калі я атрымала дыплом, узнікла жаданне вярнуцца — і ў 1999-м, калі я ўжо адчувала ў сабе сілы і ўпэўненасць, атрымала першую прэмію. Гэтая сцэна стала знакавай для многіх артыстаў, яна выклікае буру эмоцый і самых смелых мараў. І сёлета я ўжо як член журы дарослага конкурсу жадаю ўсім яго ўдзельнікам новых здзяйсненняў. Конкурс не павінен быць канчатковай вяршыняй, да якой вы імкняцеся. Гэта толькі чарговая прыступка, пасля якой трэба ставіць самому сабе ўсё новыя мэты. Бо творчы працэс — справа працяглая: спачатку ёсць толькі зярнятка, якое павінна прарасці, укараніцца, — і толькі праз час яно зможа прынесці плады.

Мой цяперашні сольны канцэрт — гэта праца не толькі ўласна мая, але і многіх-многіх іншых людзей, уключаючы кампазітараў, аранжыроўшчыкаў, дызайнераў, стылістаў, харэографаў і г.д. Акурат да фестывалю падаспелі тры яркія прэм'еры. Гэта песні "Мой бераг" Ганны Благавай на словы Ганны Сялук, "Мой куток" Арцёма Кандрацюка на словы Марыі Авіжыч і, як пралог усяго сольніка, "Мой родны край" башкірскага кампазітара, спевака і прадзюсара Урала Рашытава на словы Паўла Таіпава. Усе гэтыя песні, як бачыце, патрыятычнага ўхілу, гэта мае прызнанне ў любові да сваёй краіны. На маім канцэрце выступяць таксама Дзяржаўны ансамбль "Песняры", "Сябры" на чале з цудоўным музыкантам, народным артыстам Беларусі Анатолем Ярмоленкам. Спрыяць будзе і сама атмасфера фестывалю, які стаў калыскай беларускага мастацтва ў міжнародным атачэнні, нашым пасылам у космас, імкненнем паказаць усяму свету глыбіню і шырыню беларускай душы.

